**Александровіч, Ю.** Выдатны лінгвіст з вёскі Ухлё / Ю. Александровіч // Чырвоны прамень (Чашнікі). – 2018. – 27 лістап. – С. 5.

# ВЫДАТНЫ ЛІНГВІСТ З ВЁСКІ УХЛЁ

24 лістапада 2003 года пайшла з жыцця Юзэфа Фларыянаўна Мацкевіч. 15 гадоў таму не стала выдатнага вучонага, члена-карэспандэнта АН БССР, доктара філалагічных навук, заслужанага дзеяча навукі Беларусі. Ураджэнка вёскі Ухлё назаўсёды увайшла ў гісторыю мовазнаўства. Пасля сябе пакінула багатую спадчыну.



*Фота з інтэрнэт-партала Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Нарадзілася Ю. Ф. Мацкевіч у 1911 годзе. Сям’я жыла бедна. Васьмігадовай дзяўчынкай Юзэфа засталася без маці. Старэйшы брат, Казімір, які працаваў тады рабочым на Шклоўскай папяровай фабрыцы, прапанаваў сястры паехаць да яго. У Шклове дзяўчынка скончыла сямігодку. Затым паступіла ў Магілёўскі педагагічны тэхнікум. Атрымаўшы дыплом, два гады працавала настаўніцай пачатковай школы ў в. Гулькі Клімавіцкага раёна. У 1933-1934 гадах вучылася ў Магілёве на аднагадовых падрыхтоўчых курсах для паступлення ў ВНУ. У 1934-1938 гадах — на факультэце мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута.

Пасля заканчэння інстытута паступіла ў аспірантуру Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР. Спецыялізавалася на гісторыі беларускай мовы.

У 1945-м Юзэфа Фларыянаўна з радасцю прыняла запрашэнне на працу ў Інстытут мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, якім кіраваў Кандрат Крапіва. Увайшла ў групу складальнікаў руска-беларускага слоўніка. Адначасова падрыхтавала і ў 1946 годзе паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З 1950 года з'яўлялася загадчыцай сектара дыялекталогіі. Асноўнай задачай у тыя гады было стварэнне «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы». Арганічным працягам з'яўляецца наступная значная калектыўная праца — «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968-1969 гады). Ю. Ф. Мацкевіч разам з калегамі па працы падрыхтавала «Хрэстаматыю па беларускай дыялекталогіі» (1962 г.), «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964 г.), «Мікратапанімію Беларусі» (1974 г.). Грунтоўнай асабістай працай Ю. Ф. Мацкевіч з'яўляецца яе манаграфія «Марфалогія дзяслова ў беларускай мове» (1959 г.), якая заняла адметнае месца ў беларускім мовазнаўстве. Усяго ж яна апублікавала звыш 70 навуковых прац.

Ю. Ф. Мацкевіч да 1985 г. узначальвала сектар дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. З 1985 па 1991 г. працавала ў Інстытуце кансультантам.

**Юрый АЛЕКСАНДРОВІЧ**